Источник: "Наша слова" - 2015-04-15

# Зорка Аляксея Пысіна

20 сакавіка 2015 года ў цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі адбылася вечарына памяці Заслужанага работніка культуры Беларусі Аляксея Васільевіча Пысіна (1920-1981).

Нарадзіўся паэт у сялянскай сям'і. У 1880-86 гг. прадзед паэта і яго сыны пераехалі з Браншчыны ў Магілёўскую губерню, на "купчыя землі". За грошы, узятыя ў пазыку ў зямельным банку, купілі ў пана зямлю.

Пасля заканчэння Палужскай сярэдняй школы 1928 г. А. Пысіна накіравалі на вучобу ў Менскі інстытут журналістыкі. У верасні 1939 г. яго, тады студэнта накіравалі ў бельскую (г. Бельск, на Беласточчыне) раённую газету, дзе ён быў літсупрацоўнікам да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Вайну прайшоў сувязістам, двойчы быў паранены. Працаваў адказным сакратаром краснапольскай раённай газеты "Чырвоны сцяг" (1946 - 1948 гг.). З траўня 1950 г. працаваў у палітаддзеле Свержанскай МТС Стаўпецкага р-на Баранавіцкай вобласці. У 1956 -58 гг. вучыўся на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве. Пасля заканчэння курсаў з 1958 працаваў у рэдакцыі абласной газеты "Магілёўская праўда".

З 1974 г. да апошніх дзён быў сакратаром Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР.

Першы зборнік "Наш дзень" выйшаў у 1951 г., а ў 1959 з'явіўся наступны - "Сіні ранак". Кніга "Мае мерыдыяны" засведчыла "другое нараджэнне" паэта. У ёй, як і ў наступных ("Твае далоні", "Пойма", "Да людзей ідучы", "Ёсць на свеце мой алень", "Палёт"), разгортваецца суровы летапіс памяці. У 1968 годзе за кнігу паэзіі "Твае далоні" яму прысвоена Дзяржаўная прэмія імя Я. Купалы.

Творы А. Пысіна перакладзены на рускую, украінскую і іншыя мовы!

На яго вершы кампазітарамі напісаны песні. Імя А. Пысіна прысвоена Палужскай сярэдняй школе Краснапольскага раёна, дзе створаны прысвечаны яму музей. У Магілёве на праспекце Міру, на доме 35 а, дзе жыў паэт, устаноўлена мемарыяльная дошка...

Трэба адзначыць, што на мерапрыемстве ў бібліятэцы выступалі: паэтка Раіса Баравікова пісьменнік Віктар Карамазаў, навуковец і выкладчыца беларускай літаратуры Таццяна Хоміч, доктар філалогіі Іван Саверчанка, спявак Зміцер Сенькін... Вершы Аляксея Пысіна чытала славутая акторка Зінаіда Феакцістава. Абагульніла ўсё супрацоўніца Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Лідзія Паўлаўна Шагойка.

*Аляксей Шалахоўскі.*

Аляксей Шалахоўскі. Зорка Аляксея Пысіна